# ТЭМА: Тэатралізаванае народнае свята “МАСЛЕНКА”.

МЭТА: фарміраванне цікавасці навуэнцаў да народнай творчасці.

ЗАДАЧЫ: праз увасабленне свята “Масленка” у сцэнічным варыянце давесці да навучэнцаў узоры народнага мастацтва;

абудзіць цікавасць навучэнцаў да сваёй роднай мовы, захопленасць культурай беларускага народа, яго фальклорам, гісторыяй.

Нотны дадатак.

Сення, калі ў краіне ідзе адраджэнне нацыянальнай культуры, нацыянальнай самасвядомасці, калі мяняецца наша пакаленне, ідзе пераацэнка каштоўнасцей, мы ўсе часцей звяртаемся да спадчыны свайго краю, яго гісторыі, культуры, Менавіта там карані беларуса, гісторыя яго роду, скарбонка народнай мудрасці.

Беларусь для мяне,
Нібы матчына песня…
Што спявала мне ў сне,
І ў зімку, з прадвесня.

Вось і дачакаліся мы вясны. Наша выхаваўчая гадзіна як раз саўпадае з нашым мерапрыемствам. Восьмы тыдзень перад Пасхай называецца Масленкай. Ен мае яшчэ такія назвы як Пусты, Развітальны, Сырны, Крывы, Сырапусны. Чаму развітальны? Таму што прайшоў ужо мясаед, нельга ужо была выходзіць замуж дзяўчатам, бо пачынаецца з панядзелка 18 сакавіка пост.

Таму стараліся на гэтым тыдні добра пагуляць, павесяліцца. Масленка нездарма завецца на Русі Шырокай, таму што яна цянецца цэлы тыдзень. На Беларусі пачыналі адзначаць гэта свята у чацвер; у пятніцу – бяседныя застоллі, нядзеля развітальная, прабачальная бяседа. І менавіта ў нядзелю пачыналі гукаць вясну. Сення вы сустрэнеце тэатралізацыю рытуалаў: як просяць прабачэння ў бацькі, вешанне калодкі, ушанаванне бабкі-павітухі.

Карацей. Усё расказаць нельга будзем глядзець.

Мы пастараемся за гэты малы адрэзак часу паказаць найбольш важныя моманты свята.Вы не саромейцеся, далучайцеся да нас, удзельнічайце ў гульнях.

Добрага вам адпачынку.

*1вядучы*. Дзень добры, паважаныя госцікі-настаўнікі.

*2вядучы*. Дзень добры, паважаныя навучэнцы.

*1вядучы.* Сення мы паспрабуем з вамі правесці зіму і сустрэць вясну.

*2вядучы*. Паглядзі, што на вуліцы – сапраўдная вясна, месяц Сакавік.

*1вядучы*. А ў народзе нездарма замецілі: “Сакавік дрэвам сок пускае”.

*2вядучы*. Гэдак-гэдак, а яшчэ па надвор’і ў сакавіку маглі прадказаць:”Сакавік зялёны – ураджай благі”.

1вядучы. “Сакавік дажджом імжыцца – хлеба будзе ў рукавіцу”.

*2вядучы. “*Як у Сакавіку туман, дык у жніво дождж – пан”.

*1вядучы*. Прыйшла вясна, а разам з вясною і прыйшло свята, якое ў народзе называецца Масленкай.

*2вядучы*. Масленіца – старажытнае перадвеснавое свята ў славянскіх народаў, звязанае з культам прыроды, свята завяршэння зімы, ушанаванне сонца, яго цяпла.

*1вядучы*. Таму да гэтага свята насілі ці вазілі кола, якое сімвалізавала зіму, яго потым спальвалі, як бы развітаючыся з зімой, з усім злым і нячыстым.

*2вядучы.* Адзначалі Масленку на восьмым тыдні перад Вялікаднем (Пасхай).

*1вядучы*. Масленіца – амаль поўнасцю язычніцкае свята, бо царквой яна не адзначаецца, а нават раней забаранялася як “бесовское” свята.

*2вядучы.* Масленіца звязана з культам язычніцкага бога Вялеса. Калі Пярун быў богам князя і дружыны, Вялес – своеасаблівым народным боствам. Засталася нават старажытная назва Масленіцы – “Валоссе” у нашых суседзяў: Стаўбцоўскім і Баранавічскім раёнах.

*1вядучы.* Мяснога ужо не елі, а толькі малочнае.

*2 вядучы*. Гаварылі, што Масленіца бывае “на маладзіку”.

*1вядучы.* Гэта значыць “рог месяца ўмачыў у масла”.

*2вядучы*. Сяляне гаварылі: “Масленіца ў ветху(пасля поўні) дзяржу пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу ва ўсю руку калі Масленіца ў маладзіку”.

*1вядучы.* Што яшчэ цікавага адбывалася на Масленку?

*2вядучы.* А гэта я табе ўсяго не распавядаю, глядзі і назірай ды гасцей калі трэба запрашай.

Песня-карагод “А ў лесе, лесе да на верасе”.

*Дзед*: (седзячы за сталом). Што ўсе корпаешся, старая, як маладая перад родамі, скора госці можа прыйдуць, а ў цябе на стале, што ў лысага на галаве.

*Бабка:* Ах, ты, хрыч стары, ах ты, порхаўка старая. Лепей бы дапамог, а то толькі мелеш, як тая мянтушка!

*Дзед*: (падыходзіць да яе). Супакойся, старая, супакойся прыгажуня ты мая, якая ж ты бабулька ў мяне хвігурная(абдымае).

*Бабка:* Ідзі ўжо адсюль, пень гнілы. Людзі ж тут. О, бачыш ужо грукаюцца.

*Хлопец*: Рабяты, ну вось і апошняя хата засталася. Зараз паглядзім, ці умее яна гатаваць, гасцей частаваць. А можа яна з тых, аб кім кажуць: “І шыла, и мыла, и ткала, а ўсё языкам”.

*1 дзяўчына*: Добры дзень вам у хату!

*Бабка:* Праходзьце, госцейкі, праходзьце даражэнькія, сядайце,частуйцеся.

*2 дзяўчына*: Ой, як смачна пахне блінамі. Я бліны люблю з маслам.

*Хлопец*: А колькі ласункаў на стале. Ды і мы шмат чаго маем(дастае з кішэні гарэлку).

*Бабка*: Так, чакалі вас, чакалі, ды на стол збіралі.

*Дзед*: Мая бабка яшчэ з вечара рыхтавалася, мяне ноччу па ваду пасылала, ледзь парток у цемры не згубіў.

*Бабка*: Раняя пташка дзюбу карэбіць, а позняя вочы працірае.

*Дзед:* (да гасцей). Ну, госцейкі даражэнькія, сядайце, частуйцеся.

*Хлопец:* Чакай, гаспадар, рана яшчэ. Хлопцы, цягніце калодку, у нас яшчэ Тэкля замуж не выйшла!(прывязваюць калодку). Тэкля, дык чаму ж ты замуж не выйшла?

*Дзяўчына*: Прыходзілі да яе сваты, угаварвалі яе так, і сяк, а яна ні ў якую. Чаму? Га?

*Тэкля:* Нагадала мне варажбітка, што першы муж будзе п’яніца,другі – гуляка, дык я хачу адразу за трэцяга пайсці.Ды толькі дзе ж яго узяць?

*Дзяўчына*: А так табе і трэба, навыбіралася!

*Тэкля*(да хлопца). Ну, хопіць ужо, адчапіся ад мяне. Прычапіўся, як лісце ў лазні.

*Хлопец:* Ой, няма ў мяне чым адкупіцца. Ну здыміце хлопцы калодку.

*Хлопец:* Калі так, адгадай 2 загадкі: “Што рабілі, збіралі ды на стол засцілалі?”

*Тэкля*: (думае). Ну. Вы мне і загадку загадалі. Доўга думаць прыйдзецца. Хлопцы, мабыць, гэта абрус?

*Хлопец:* Ну, вось, а казала, што доўга думаць. Цяпер яшчэ адну:

Залатая бочачка
Уранку пакацілася-
Ні стукату,
Ні грукату, не упала, не разбілася,
Калі ж накрасавалася-
За цёмны лес схавалася. (Сонца

Вешаюць калодку каму з гасцей. (не замужніх)

Яно для усіх нас-

Добры сябр,
Хоць дзіваком здаецца,
Што надзяе вясной кажух,
А ўвосень раздзяецца.        (Лісцевае дрэва)

*2дзяўчыны* распавядаюць аб нялегкім жыцці замужняй жанчыны.

*1 дзячўына*: Вы ж думаеце, што замужам салодка? Мяне муж называе горшай за самую ліхую хваробу.

*2 дзяўчына*:А вось я, напрыклад, запыталася ў свайго:"Даражэнькі, што б ты рабіў, калі б убачыў,што на мяне накінуўся воўк?"Дык ен мне сказаў: "Пажадаў бы яму прыемнага апетыту", - вось яго любоў.

*1 дзяўчына*: А той жа п'яны на днях вярнуўся дадому, але я яго вырашыла не лаяць, надта спаць хацелася. Дык ен нахабнік мне крычыць: "Гэй, старая, прачынайся ды аблай мяне трошкі, каб не здавалася, што я цвярозы!"

*2 дзяўчына*: Ну, даражэнькая, хопіць языком мянціць, лепш давайце патанцуем!

Танец "Падыспан".

*Тэкля:* Паважаныя гаспадары. Хлопцы мне прывязалі калодку, а ў вас жа Алесь есць. Ен таксама нежанаты. Нешта няма яго, мо баіцца?

У гэты час заходзіць Алесь, апрануты ў сучаснае адзенне і напявае песенькі.

*Алесь:* А гэта, што тут робіцца?
*1 дзяўчына*: Масленіцу сустракаем.
*2 дзяўчына*: У гульні гуляем.
*Алесь*: А я гэта, думаў, што новая рок-група завітала да нас ў Нясвіж.
*1 дзяўчына*: Зараз мы табе калодку прывяжам.

Кідаюцца да яго і вешаюць калодку.

*Алесь:* Адчапіцеся вы ад мяне. Усё што хочаце зраблю, толькі здыміце калодку.
*1 дзяўчына*: Ах, які ты разумненькі, мы цябе адпусцім толькібудучае прадкажы.
*Алесь*: Усё што хочаце зраблю, нават будучыню прадкажу.
*Дзяўчына:* Станавіцеся, хто хоча сваё будучае наперад знаць!

Накідваюць Алесю на галаву хустку. Ідзе гульня ў "Прарока".
Пасля гульні ўваходзіць бабка-павітуха.

*Алесь:* О, глядзіце, к нам завітала і бабка-павітуха. Яшчэ ніхто не ражае, а яна тут.

*1 дзяўчына*: Вось пусты, дык пусты. Бабку-павітуху заўсёды наведваюць на Масленіцу. А тут яна сама да нас завітала.

*Бабка-павітуха*: А што ты мне скажаш яшчэ галубок?

*Алесь:* Нас табе частаваць, а нам цябе шанаваць!

*Бабка-павітуха*: Пабач, якая моладзь разумная пайшла. Ну, хто хоча пачастункі атрымаць?

*Дзяўчаты*: Мы! Заспяваем песню-гульню "Проса".

Карагод-песня "Проса".

*Бабка-павітуха*: Добра спяваеце, зарабілі вы ласункаў, частуйцеся.(Дае талерку з блінамі). Хлопцы, а вы гэта што, ні на што ні здольныя? Га?

*Хлопцы*: Чаму? Можа яшчэ і лепшыя!

*Бабка-павітуха*: Хто з вас лепей бліны есць, з апетытам праблем не мае?

2 хлопцы спаборнічаюць, хто хутчэй з'есць бліны.

*Бабка-павітуха*: (звяртаецца да прысутных). А вы, даражэнькія, чаму сядзіце? Няўжо не хочаце пачастунак атрымаць? (Хто з'сць здобу першы).
*Дзяўчына*: Ну, бабка, павесяліла ты нас. Зараз наша чарга.

Бабка-павітуха садзіцца на пакрывала і хлопцы цягнуць яе да дзвярэй.

*Дзед*: Ну, павесяліла нас бабка! Старая, але спрытная. Дык і я не вельмі стары. Магу яшчэ і цалавацца. Я ведаю гульню, якая завецца Карта-пацалунак"

Гульня.

*1 дзяўчына*: Ай, хлопцы, зацалавалі вы нас, ўжо вясна ў вокны стукае. Пара Масленіцу хаваць.

Кожная дзяўчына і Алесь па чарзе падыходзяць да бацькі. Ен сядзіць за сталом ў строгім настроі.

*Алесь*: Прабач, бацька родны, калі чым награшыў перад табою, справаю ці языком.

Потым тыя ж словы гаварылі дзяўчаты па чарзе. Калі ўсе сказалі, тады сам гаспадар прасіў прабачэння.
Пасля слоў гаспадара ўсе ўдзельнікі: "Прабачце, паважаныя настаўнікі, калі чым паграшылі перад вамі, справаю ці языком!"

*Дзед:* Бярыце хлопцы чучала, ды ўсё кепскае каб адышло трэба яго спаліць. А мы паназіраем.
*Бабка:* Бывайце госцікі добрыя. Напаследак пачастуйцеся.

## А МЫ ПРОСА СЕЯЛІ.

Дзяўчаты. А мы проса сеялі, сеялі
Люлі, млоды сеялі, сеялі.(пасля кожнага радка)
Хлопцы. А мы проса вытапчам, вытапчам
Дзяўчаты. А чым жа вы стопчаце, стопчаце?
Хлопцы. А мы каней выпусцім, выпусцім
Дзяўчаты.А мы каней паловім, паловім
Хлопцы. А чым жа вы зловіце, зловіце?
Дзяўчаты.А шаўковым повадам, повадам
Хлопцы. А шаўковы повад парвецца
Дзяўчаты.А мы каней выкупім, выкупім
Хлопцы. Ды чым жа вам выкупіць, выкупіць?
Дзяўчаты.А мы дадзім сто рублеў, сто рублеў
Хлопцы. Не трэба нам тысячы, тысячы
Дзяўчаты.А мы дадзім дзяўчыну, дзяўчыну
Хлопцы. Вось гэта трэба нам, трэба нам.

Хлопцы падыходзяць да дзяўчыны і становяцца кругам вакол яе. Дзяўчына танцуе, а хлопцы пляскаюць у далоні. Гульня спыняецца, калі усе ўдзельнікі апынуцца ў адным радзе.

## А У ЛЕСЕ, ЛЕСЕ ДЫ НА ВЕРАСЕ

1.А ў лесе, лесе
Ды на верасе
Вясна-красна
На увесь свет.
2.Малады там хлопчык
Ды абед нясе.
3.А яму дзяўчына
Да абед нясе
4.Сядзьма разам хлопчык
Паабедайма.
5.А я па абедзе
Скажу табе дзіва
6.Скажу табе дзіва
Найдзіўнейшае.
7.Гэтаю вясною
Пабярэмося.
8.Мужам і жаною
Застанемося.